// Весці

**БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

**№ 3 (25) 2000**

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

*Галоўны рэдактар:*
Л. Н. Ціханаў

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар (*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Г. А. Космач
І. А. Новік
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. В. Фіялкоўская (*адказны сакратар*)
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

## ЗМЕСТ

*Педагогіка*

*Цімашкова Л. М.* Камунікатыўная кампетэнтнасць настаўніка як прафесійна значны феномен ........ 3

*Якаўлева Н. У.* Структура ацэначнай дзейнасці настаўніка ........ 10

*Вадзінскі Д. І.* Эстэтычны густ ........ 15

*Вязгіна В. І.* Творчая гульня як сродак фарміравання маральных паводзін малодшых школьнікаў ........ 19

*Жыбуль Н. П.* Геаметрычныя пераўтварэнні ў курсе матэматыкі 5—9 класаў агульнаадукацыйнай школы ... 23

*Малахаў С. У., Салычыц А. Ф.* Матывацыйныя асновы фізкультурнай актыўнасці студэнтаў 1—2 курсаў ........ 28

*Мовазнаўства*

*Трофимович Т. Г.* Фразеологизация неоднословных наименований в языке старорусской деловой письменности ........ 32

*Иватович В. Т.* Некоторые особенности художественного перевода с близкородственных языков ........ 37

*Мормыш Л. С.* Маркированная лексика в переводах произведений М. Горецкого на русский язык ........ 41

*Этымалагічны эцюд*

*Груца А. П.* Праславянскае *kemlet і вытворныя ад яго ў беларускай мове ........ 46

*Літаратуразнаўства*

*Гаранін С. Л.* Ідэйна-эстэтычная арыентацыя Афанасія Філіповіча ........ 49

*Ворон Д. Д.* Особенности композиции романа Л. Н. Толстого «Воскресение» ........ 54

*Музыказнаўства*

*Мазурына Н. Г.* Дзіцячая песнятворчасць у беларускай народнай культуры: варыянтнасць існавання ....... 60

*Гісторыя*

*Касовіч В. Ф.* Моладзь Рэспублікі Беларусь 80—90-х гадоў: дэмаграфія, жыццяздольнасць, перспектывы ..... 65

# ГІСТОРЫЯ

УДК 323(475)

*В. Ф. Касовіч*

## МОЛАДЗЬ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 80—90-Х ГАДОЎ: ДЭМАГРАФІЯ, ЖЫЦЦЯЗДОЛЬНАСЦЬ, ПЕРСПЕКТЫВЫ

Гісторыкі, філосафы, прадстаўнікі іншых сацыяльна-гуманітарных навук прыходзяць да думкі, што ў цэнтры ўвагі сучаснай дэмаграфічнай палітыкі павінен быць не проста чалавек, а чалавек малады як стратэгічны курс грамадства, носьбіт будучыні. Моладзь — галоўная каштоўнасць грамадства, гэта паняцце не толькі дэмаграфічнае, але таксама эканамічнае, сацыяльнае, палітычнае.

Такі падыход да ацэнкі моладзі, стаўка на моладзь сёння, на будучыя пакаленні здольны выпрацаваць палітыку грамадства і дзяржавы, працуючую на кіраванне працэсамі, на папярэджванне падзей замест палітыкі спозненай рэакцыі на існуючыя супярэчнасці і праблемы. Новая, моцная і эфектыўная маладзёжная палітыка, і перш за ўсё дзяржаўная, дазволіць ажыццявіць паскоранае развіццё, прарыў рэспублікі на перадавыя пазіцыі сацыяльнага прагрэсу.

У рэспубліцы праблемы моладзі не атрымалі дастатковага асвятлення ў навуцы. Асобным пытанням жыцця і дзейнасці падрастаючага пакалення прысвечаны канферэнцыі: «Роля сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у фарміраванні каштоўнасных арыентацый будучага настаўніка» (Віцебск, 1994); «Тэорыя і практыка выхаваўчай работы ў вышэйшых навучальных установах» (Горкі, 1997); «Каштоўнасныя арыентацыі беларускай моладзі на рубяжы XX стагоддзя» (Магілёў, 1998).

Даследаванне працэсаў у маладзёжным асяроддзі становіцца асабліва актуальным і ў святле дэмаграфічных змен, якія праходзяць у нашым грамадстве. За перыяд паміж перапісамі насельніцтва 1989 і 1999 гг. доля моладзі ў складзе насельніцтва скарацілася амаль на 15% і працягвае зніжацца [1]. Грамадства хутка старэе. Рэзка скарачаецца нараджальнасць.

На 1 студзеня 1999 г. у рэспубліцы пражывала 4 144,7 тыс. дзяцей і моладзі (0—29 гадоў), што склала 41% насельніцтва краіны [1]. Іх жыццяздольнасць залежыць ад стану спраў у грамадстве, сацыяльна-эканамічнай і дэмаграфічнай сітуацыі,

ад таго, як клапоціцца пра іх дзяржава. З 1993 г. у рэспублі[ц]
зафіксавана неспрыяльная дэмаграфічная сітуацыя, памяншае[ц]ца агульная колькасць дзяцей. У 1994—1997 гг. гэта памяншэ[н]не склала 206,1 тыс. дзяцей, у тым ліку ў 1994 г. — 41,8, 1995 — 49,6, 1996 — 54,5 , 1997 — 60,2. У выніку доля дзіця[ч]чага насельніцтва (0—17 гадоў) у агульнай колькасці жыхароў рэспублікі знізілася з 27,19% у 1991 г. да 25,53% у 1998 [2]. Значна павялічылася мацярынская і дзіцячая смяротнасць.

У наяўнасці цяжкі крызіс сям'і, асабліва маладой. Паказчык колькасці заключэння шлюбаў рэзка скарачаецца ў 90-х гг. з 9,7 шлюбаў на тысячу насельніцтва ў 1990 г. да 7,3 — у 1994. Адпаведна паказчык разводаў вырас з 3,4 на тысячу насельніцтва да 4,3 [3], прычым каля 70% разводаў прыпадае на маладыя сем'і.

У выніку росту распаду шлюбаў, аўдавення павялічылася колькасць няпоўных сямей, асабліва тых, якія ўзначальваюцца маці. У 1994—1997 гг. у выніку распаду сям'і штогод 45 тыс. дзяцей заставаліся без аднаго з бацькоў. У 1997 г. 14,5 тыс. дзяцей нарадзілася па-за шлюбам, з іх 2,7 тыс. дзяцей нарадзілася ў маці, якая маладзей за 18 гадоў. Колькасць сірот пры жывых бацьках павялічылася на 3,5 тыс. і склала на 1 студзеня 1998 г. 23,6 тыс. дзяцей. Усяго ў 1997 г. органамі аховы дзяцінства выяўлена 5,7 тыс. сацыяльных сірот. Паводле вынікаў 1997 г., мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі праз судовыя пасяджэнні адабрана ў бацькоў 4,5 тыс. дзяцей, што ў 6 разоў больш, чым у 1990 г. [2, с. 21].

Ва ўмовах павальнага збяднення насельніцтва сярэднестатыстычная беларуская сям'я перайшла да стратэгіі фізічнага выжывання, вымушана траціць усе сродкі на харчаванне і адзенне, не пакідаючы амаль нічога на адпачынак, культурныя патрэбы. Выхаваўчы патэнцыял сям'і, яе роля ў сацыялізацыі новых пакаленняў значна панізіліся і працягваюць зніжацца. Пераважная большасць сямей арыентуецца на аднаго-двух дзяцей, а гэта недастаткова для простага ўзнаўлення насельніцтва.

Працягвае зніжацца нараджальнасць, якая на пачатак 1997 г. склала 9,3 праміле, што на 44% менш, чым у 1985 г., а на 1 студзеня 1998 г. — 8,8 праміле. Калі да 1986 г. нараджальнасць мела сярэднегадавы прырост 1,66, то пасля 1986 — адзначана выражанае зніжэнне з сярэднегадавым тэмпам 8,3%, прычым у 1997 г. яно склала 5%. Сучасны ўзровень нараджальнасці не забяспечвае простага ўзнаўлення насельніцтва, сумарны паказчык нараджальнасці ў 1997 г. складаў усяго 1,2 дзіцяці на адну жанчыну, у той час як для простага ўзнаўлення неабходна, каб на кожную жанчыну ў сярэднім прыходзілася не менш за 2,15 дзіцяці [2, с. 26]. Прычынай зніжэння нараджальнасці з'яўляецца

супадзенне дзеяння шэрага фактараў, перш за ўсе асаблівасці структуры насельніцтва. Найбольш актыўны дзетанараджальны ўзрост 20—29 гадоў (на яго прыпадае 70% усіх, хто нарадзіўся ў рэспубліцы). На пачатак 1994 г. у Беларусі ў гэтым узросце было на 290 тыс. жанчын менш, чым у 1985 г. У выніку знізілася нараджальнасць у пачатку 90-х гг. амаль на 60%, што было прадпісана дэфармацыяй структуры насельніцтва, якая склалася яшчэ ў 60-я гг.

На дэмаграфічныя працэсы ўплывае сацыяльна-эканамічная нестабільнасць, спад эканамічнага развіцця, узрастаючая інфляцыя, дэстабілізацыя спажывецкага рынку, беспрацоўе, жыллёвыя праблемы, збядненне насельніцтва. Людзі не ўпэўнены ў заўтрашнім дні. Экалагічныя вынікі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, якія абвастрылі хваляванне бацькоў за сваіх дзяцей, таксама ўплываюць на дзетанараджальнасць. Бацькі, якія жадаюць мець у сям'і двух-трох дзяцей, а многія (кожны восьмы) — і больш, «пакуль» маюць па аднаму, адкладваюць нараджэнне астатніх да «лепшых часоў».

У двух з пяці выпадкаў зніжэнне нараджальнасці прадпісана сацыяльна-эканамічнымі і экалагічнымі прычынамі [4, с. 6].

На зніжэнне нараджальнасці ўплывае таксама хуткае змяненне сістэмы каштоўнасцяў, узрастаючая арыентацыя на самарэгуляцыю асобы. Калі 10—20 гадоў назад асноўнай каштоўнасцю людзі лічылі цікавую і творчую працу, то сёння 95% апытаных у працы імкнуцца да больш высокага заробку. 35% тых, хто прыняў рашэнне заняцца самастойнай прадпрымальніцкай дзейнасцю ці фермерствам, заявілі, што асноўны матыў іх выбару — гэта «магчымасць укладваць у працу ўсе сілы, атрымліваць добры прыбытак, паляпшаць жыццё сям'і, пакінуць дзецям спадчыну» [4, с. 6].

Пра тое, што ў 90-я гг. знізіцца нараджальнасць, дэмографы папярэджвалі яшчэ за 10 гадоў. Але ніякіх мер у краіне не было прынята.

У другой палове 90-х гг. (па меры ўступлення ў прадукцыйны ўзрост тых, хто з'явіўся на свет у 70-я гг.) паніжэнне нараджальнасці павольна прыпынілася. Затым, па меры ўступлення ў прадукцыйны ўзрост жанчын 80-х гадоў нараджэння, павінен пачацца рост нараджальнасці дзяцей. Да часу, калі стабілізуецца сацыяльна-эканамічны стан у рэспубліцы і будзе прынята больш эфектыўная дэмаграфічная палітыка, нараджальнасць можа павялічыцца. Чакаецца паніжэнне ўзроўню нараджальнасці па структурных прычынах у другім дзесяцігоддзі XXI ст., калі ў дзетародны ўзрост уступяць тыя, хто нарадзіўся ў 90-я гг.

Негатыўныя сацыяльныя вынікі названых дэмаграфічных працэсаў на Беларусі зразумелы: яны адмоўна адаб'юцца на ўсіх

сферах, на тэмпах сацыяльнага развіцця і прагрэсу ў цэлым. Не можа грамадства, якое старэе, страчвае энергію і актыўнасць маладосці, эфектыўна вырашаць якасна новыя, складаныя і ўзрастаючыя ў памеры задачы.

У рэспубліцы ўзмацняецца працэс старэння насельніцтва. У адпаведнасці з класіфікацыяй ААН, насельніцтва лічыцца старым, калі доля асоб, старэйшых за 65 гадоў, складае 7%. Паводле даных перапісу насельніцтва 1999 г., у рэспубліцы доля гэтай часткі насельніцтва перавышае 13%. Пятая частка ўсяго насельніцтва — асобы старэй працаздольнага ўзросту [1].

Тэндэнцыю, небяспечную для любога грамадства, мае паказчык зніжэння сярэдняй працягласці жыцця насельніцтва. У Рэспубліцы Беларусь сярэдняя працягласць жыцця скарацілася з 71,1 года ў 1990 г. да 68,7 — у 1998 г.

Гэта вынік росту паказчыка смяротнасці практычна ў любым узросце і па ўсіх прычынах. Насцярожвае рост паказчыкаў смяротнасці дзяцей і хуткі рост смяротнасці мужчын і жанчын у працаздольным узросце. Працягласць жыцця мужчын (64,9 гадоў) на 9,7 года менш, чым жанчын (74,3 гады). Павялічваецца смяротнасць ад новаўтварэнняў, няшчасных выпадкаў, атручванняў, траўм і хвароб. Асноўнымі прычынамі гэтага з'яўляюцца падзенне дабрабыту насельніцтва, пагаршэнне працы органаў аховы здароўя, рост захворванняў, памяншэнне даступнасці для насельніцтва эфектыўных лекавых сродкаў, дабраякасных прадуктаў харчавання, траўматызм, алкагалізм, высокая ступень старэння насельніцтва.

Насцярожвае высокая ступень дыферэнцыяцыі паказчыка смяротнасці паміж горадам і вёскай. Смяротнасць сельскага насельніцтва ў Беларусі ад усіх прычын у 2,3 разы вышэй, чым гарадскога, што звязана з меншай даступнасцю для сельскіх жыхароў паслуг аховы здароўя, асабліва высакаякасных.

Відавочна тэндэнцыя пагаршэння здароўя дзяцей і моладзі. Кожнае наступнае пакаленне менш здаровае, чым папярэдняе. Толькі 14% дзяцей практычна здаровыя. У Мінскай вобласці ў 1999 г. 7% нованароджаных былі прызнаны здаровымі, 50% дзяцей маюць адхіленні ў здароўі, 35% — хранічна хворыя. Да службы ў арміі годны адзін з пяці прызыўнікоў. Амаль кожнае дзявятае дзіця дашкольнага і школьнага ўзросту мае асаблівасці разумовага і фізічнага развіцця. На 2 тыс. чалавек у 1995 г. павялічылася колькасць дзяцей-калек да 16 гадоў, якая склала 20,5 тыс. чалавек. На 1 студзеня 1997 г. іх было ўжо 21,9 тыс. чалавек, з іх 365 дзяцей сталі калекамі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. На 1 студзеня 1998 г. у краіне налічвалася 22 912 дзяцей-калек, з іх 1 021 — чарнобыльцы. На 1 студзеня 1999 г. колькасць дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 16 гадоў склала

23 866 чалавек, гэта значыць, што са студзеня 1998 г. іх колькасць узрасла на 4,2% [2, с. 23].

На 1 верасня 1996 г. у рэспубліцы зарэгістравана 241 547 дзяцей да 14 гадоў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, што склала 10,9% ад агульнай колькасці дзяцей гэтага ўзросту. Больш паловы дзяцей з дадзенымі адхіленнямі знаходзілася ва ўзросце 10—14 гадоў. З агульнай колькасці ўлічаных дзеці з паталогіяй унутраных органаў і органаў кроваўтварэння склалі 40%, каля 20% мелі зрокавыя парушэнні, 16% — разумовыя, 9,5% — рухальныя, 9% — языковыя і моўныя, 3,7% — выродлівыя і 2% — слыхавыя [2, с. 26].

Здароўе нацыі стала праблемай малодшых пакаленняў, а гэта значыць, што генафонд Беларусі пад пагрозай.

Паказчык смяротнасці нованароджаных, які да пачатку 90-х гг. увесь час зніжаўся, на сёння набыў відавочную тэндэнцыю да росту (у 1992 г. — 12,3, 1993 — 12,5, 1994 — 13,2, 1995 — 13,3) [3, с. 69].

Хуткімі тэмпамі і ў шмат разоў пагаршаецца матэрыяльна-бытавое становішча моладзі, дзве трэці якой (асабліва навучэнцы, студэнты, сельская моладзь) жыве за мяжой беднасці. Відавочны працэс збяднення моладзі. Зарплата маладых людзей, якая складае крыху больш паловы зарплаты кадравых працоўных, скарачаецца. Гранічна абвастрылася праблема жылля. Павялічваецца і без таго значная матэрыяльная залежнасць маладых людзей ад бацькоў (80% з іх карыстаюцца бацькоўскай дапамогай). Даследаванні паказваюць, што адным з асноўных фактараў беднасці ў Беларусі з'яўляецца высокая апякунская нагрузка. Менавіта ад яе залежыць адносна нізкі ўзровень прыбытку ў шматдзетных і няпоўных сем'ях. Найбольш безабароннай узроставай групай з'яўляюцца дзеці. Узровень беднасці дзяцей да 15 гадоў складае 45%.

Нарастаючае беспрацоўе асабліва балюча адбіваецца на моладзі. Сярод зарэгістраваных у службе занятасці ў якасці беспрацоўных 77% выпускнікоў агульнаадукацыйных школ, 75% — прафтэхвучылішч, 81% — тэхнікумаў.

На 1 снежня 1995 г. у ліку беспрацоўных 6% складалі маладыя людзі ва ўзросце да 18 гадоў, 31% — ад 18 да 25, 17% — ад 26 да 30 гадоў [3, с. 26].

Пашыраецца працэс дэсацыялізацыі, маргіналізацыі моладзі, гэта значыць павялічваецца колькасць дзяцей, падлеткаў і маладых людзей, якія апынуліся ў стане ізгояў грамадства. У сілу розных прычын да маргіналаў сёння адносяць не толькі безнадзейных маладых наркаманаў, алкаголікаў, людзей, пакутуючых некаторымі асобымі відамі захворванняў, «прафесійных» жабракоў і бадзяг, але таксама вялікую колькасць маладых інвалідаў,

асоб, адбыўшых пакаранне ў папраўча-працоўных установах. Часам маргіналы імкнуцца стаць сацыяльна-карыснымі грамадзянамі, але ў сілу сённяшніх сацыяльных умоў не могуць гэтага зрабіць. Колькасць бяздомных дзяцей, дзяцей-наркаманаў і алкаголікаў, непаўналетніх мацярэй-адзіночак хутка павялічваецца [5].

Асабліва востра стаіць праблема неўладкаванасці, расчаравання ў жыццёвых магчымасцях, у прафесійным і культурным росце ў сялянскай моладзі.

Вымушаныя рушыць у горад у пошуках жыццёвай перспектывы, парываючы сувязь з «каранямі», маладыя сяляне часта не знаходзяць сябе ў горадзе і становяцца люмпенамі.

Крызіс эканомікі, сям'і і іншыя негатыўныя сацыяльныя працэсы дазваляюць сцвярджаць, што колькасць маргіналаў будзе павялічвацца. Найбольш хутка павялічыцца колькасць бяздомных. Паколькі маргіналізацыя цесна звязана і абумоўлена падзеннем жыццёвага ўзроўню, звужэннем магчымасці атрымання адукацыі і кваліфікацыі, то ў перспектыве можна чакаць з'яўлення цэлага пакалення людзей, не валодаючых ні ведамі, ні кваліфікацыяй, ні жаданнем працаваць наогул — пакалення адзіночак, адрынутых, людзей «на дне», бедных людзей.

Працэс маргіналізацыі моладзі з'яўляецца вельмі небяспечным, бо закранае ўклад жыцця і глыбінныя пласты свядомасці значнай колькасці маладых людзей, што можа адбіцца на грамадстве ў будучыні.

Ва ўмовах, калі большасць насельніцтва (да 60%) лічыць сябе збяднелым, адбываецца рух у масавай псіхалогіі ў бок «слабасці», «безабароннасці» і сацыяльнай пасіўнасці тысяч маладых людзей.

Павялічваюцца тэмпы крыміналізацыі дзяцей і моладзі. У кожным наступным пакаленні моладзі злачынцаў больш, чым у папярэднім. За апошнія 5 гадоў рост злачыннасці непаўналетніх апярэджваў тэмпы ў параўнанні са злачыннасцю дарослых. Цяпер маладымі людзьмі робіцца больш паловы ўсіх злачынстваў. У грамадстве нарастае канфліктнае становішча, і гэта правакуе рост экстрэмізму, згвалтаванняў. Ва ўмовах нестабільнасці ствараюцца магчымасці для злачыннай дзейнасці. Неўладкаванасць і канфлікты ў сем'ях, спад прэстыжу адукацыі і культуры вядуць да павелічэння культу сілы. Рост злачыннасці моладзі наносіць вялізны матэрыяльны і маральны ўрон грамадству, ды і ёй самой. Паняцце маладосці сёння звязваецца з паняццем жорсткасці, небяспекі. Моладзь пачынаюць баяцца, нават ненавідзець, праціпастаўляць яе «дарослсаму» грамадству.

На думку спецыялістаў, злачыннасць моладзі будзе ўзрастаць. Яшчэ большае распаўсюджванне атрымаюць крадзяжы, спекуляцыя. Павялічыцца колькасць падлеткаў, уцягнутых

у гандаль наркотыкамі, прастытуцыю, раскраданне зброі. Злачыннасць пачне скарачацца пры паляпшэнні сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, маральнага статусу моладзі ў грамадстве, пры правядзенні эфектыўнай сацыяльнай, у тым ліку дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, адной з плыняў якой павінна быць праграма па барацьбе са злачыннасцю.

Дэмаграфічныя праблемы на першы погляд не такія прыкметныя, як эканамічныя, але і іх роля застаецца важнай. Дэмаграфічныя страты цяжка аднаўляюцца. Вельмі часта пераадоленне негатыўных вынікаў у гэтым напрамку патрабуе змены некалькіх пакаленняў. На сучасным этапе неабходна сканцэнтраваць сілу на стварэнне належных умоў для фарміравання сямей, нараджэння дзяцей, зніжэння колькасці заўчаснай смяротнасці.

Падрабязная публікацыя вынікаў перапісу насельніцтва 1999 г. дазволіць зрабіць больш грунтоўны аналіз стану дэмаграфічных працэсаў сярод моладзі на Беларусі ў 90-я гг. Іх глыбокае навуковае асэнсаванне дасць магчымасць распрацаваць грунтоўную сацыяльна-эканамічную палітыку на бліжэйшую перспектыву. Важна ўлічваць дэмаграфічныя асаблівасці ўжо зараз у галіне адукацыі, падрыхтоўкі нацыянальных кадраў.

Рэспубліцы Беларусь як незалежнай суверэннай дзяржаве трэба вывучаць і ў значнай меры ўплываць, як гэта робяць у высокаразвітых дзяржавах, на складаныя дэмаграфічныя працэсы, асабліва сярод дзяцей і моладзі.

На Беларусі жыве 2 189,2 тыс. маладых людзей ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў. Трэба прыцягнуць моладзь да ўдзелу ў грамадскіх пераўтварэннях. У цэнтры ўвагі сучаснай палітыкі павінна апынуцца моладзь як стратэгічны рэсурс грамадства, як носьбіт будучыні, крыніца інавацый і фактар перамен. Чалавек, і перш за ўсе дзеці, моладзь, — вось галоўнае поле сучасных грашова-матэрыяльных і духоўных інвестыцый дзяржавы.

## *ЛІТАРАТУРА*

1. Колькасць і асноўныя сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі насельніцтва Рэспублікі Беларусь паводле даных перапісу насельніцтва 1999 года //Народная воля. 1999. 24 снеж.

2. Первый периодический доклад по осуществлению положений конвенции ООН о правах ребенка //Адукацыя і выхаванне. 1999. № 5—6.

3. Дзеці і жанчыны Беларусі: сёння і заўтра: Нацыянальны даклад аб становішчы дзяцей і жанчын у Беларусі. Мн., 1995. С. 17.

4. *Шахотько Л.* Слухи о кончине брака не подтвердились //Дело. 1994. № 12. С. 4—6.

5. Каждый четвертый белорусский наркоман — несовершенно-летний //Народная воля. 2000. 16 лют.

SUMMARY

*The part of young people in the structure of uor country's population continues to decrease. That affects negatively the tempos of social development and progress as a whole. The growing old society can not solve effectively new, difficult and increasing problems. It is necessary to influence the demographical problems especially among children and youth.*

УДК 371.54

*А. І. Курак*

# ПРАБЛЕМЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ МЯСЦОВАГА КІРАВАННЯ І САМАКІРАВАННЯ З ОРГАНАМІ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ У ЗАБЕСПЯЧЭННІ ЗАКОННАСЦІ І ПРАВАПАРАДКУ

Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь дэмакратычнай прававой дзяржавай прадугледжвае значнае ўзрастанне ролі мясцовага кіравання і самакіравання як фактару, які ў многім вызначае поспех сацыяльна-эканамічных і палітычных пераўтварэнняў, стабільнасць і прагрэс у грамадстве. Вырашэнне гэтых задач магчыма пры забеспячэнні трывалага правапарадку і законнасці, што павінна разглядацца мясцовымі Саветамі і выканаўчымі камітэтамі (адміністрацыямі) як адзін з важнейшых напрамкаў іх дзейнасці. У сувязі з гэтым выглядаюць неперакануаўчымі і непрымальнымі думкі, што барацьбой са злачыннасцю, правапарушэннямі і іншымі антыграмадскімі з'явамі павінны займацца толькі праваахоўныя органы. Такі падыход, на наш погляд, памылковы, паколькі рашэнне гэтых пытанняў не можа ажыццяўляцца без удзелу, а ў некаторых выпадках нават і кіраўніцтва, з боку органаў мясцовай улады. Больш таго, гістарычны вопыт сведчыць, што ігнараванне гарызантальнага падпарадкавання органаў унутраных спраў негатыўна адбівалася на стане правапарадку і законнасці ў краіне, прыводзіла да згортвання дэмакратычных працэсаў.

Ва ўмовах радыкальных пераўтварэнняў у дзяржаўным і грамадскім ладзе Рэспублікі Беларусь, ажыццяўленне прававой рэформы роля Саветаў дэпутатаў і выканкамаў у галіне забеспячэння законнасці і правапарадку, наадварот, павінна ўзмацняцца. Для непасрэднага ажыццяўлення гэтых функцый мясцовыя органы ўлады ствараюць аддзелы (упраўленні) унутраных спраў, якія ім падпарадкаваныя і падкантрольныя. Аднак гэта кіраўніцтва